ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ, КІРАЎНІЦТВА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР, МІНІСТЭРСТВА КІНЕМАТАГРАФІІ БССР І КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫХ УСТАНОЎ ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР.

№ 19 (773) | Субота, 6 мая 1950 года | Цана 50 кап.

9-га мая—5-я гадавіна нашай гістарычнай перамогі над фашысцкай Германіяй.

Няхай жыве гераічны совецкі народ і яго слаўныя Узброеныя Сілы!

Няхай жыве наш вялікі правадыр і палкаводзец таварыш Сталін!

Народ-пераможца

9 мая — свята Перамогі, дзень вялікай славы нашай Радзімы, нашых доблесных Узброеных Сіл. Пяць год таму назад быў ушчэнт разбіты самы злосны і крывяжэрны вораг — германскі фашызм.

«Вялікія ахвяры, — гаворыць таварыш Сталін, — прынесеныя намі ў імя свабоды і незалежнасці нашай Радзімы, незлічоныя нястачы і пакуты, перажытыя нашым народам у ходзе вайны, напружаная праца ў тылу і на фронце, аддадзеная на алтар Бацькаўшчыны, — не прайшлі дарма і ўвянчаліся поўнай перамогай над ворагам».

Совецкі народ, кіруемы большэвіцкай партыяй і таварышам Сталіным, перамог, насуперак жаданням і планам міжнароднай рэакцыі, якая ўскарміла і ўспаіла фашысцкага драпежніка і ўсімі сіламі падтрымлівала яго ў час вайны. Рэакцыйныя сілы наўмысля адкладвалі адкрыццё другога фронта, вялі здрадніцкія перагаворы аб сепаратным міры з гітлераўскай Германіяй, рабілі стаўку на паражэнне Совецкага Саюза ў вайне. Нічога не памагло: Совецкі Саюз вышаў пераможцам у гэтай цяжкой бітве за будучыню чалавецтва.

Законны гонар ахоплівае совецкіх людзей пры ўсведамленні таго, што соцыялістычны лад, створаны Леніным і Сталіным, аказаўся самым трывалым грамадскім ладам і не толькі не аслабеў, а яшчэ больш умацаваўся ў полымі вайны.

Совецкі народ ведае, што важнейшай умовай нашай перамогі з'явілася мудрае кіраўніцтва большэвіцкай партыі, таварыша Сталіна. Партыя Леніна—Сталіна — магутная накіроўваючая сіла совецкага грамадства. Яна з'ядноўвала і накіроўвала да адзінай мэты ўсе намаганні нашага народа. Геніяльным натхніцелем і арганізатарам нашых перамог з'яўляецца таварыш Сталін. «Гэта наша шчасце, што ў цяжкія гады вайны Чырвоную Армію і совецкі народ вёў наперад мудры і выпрабаваны правадыр Совецкага Саюза — вялікі Сталін» (В. Молатаў).

І цяпер, у пасляваенныя гады, большэвіцкая партыя, вялікі Сталін натхняюць наш народ на слаўныя працоўныя подзвігі. Мы сустракаем свята Перамогі вялікімі дасягненнямі на ўсіх участках комуністычнага будаўніцтва. Усё больш і больш паскараюцца тэмпы развіцця народнай гаспадаркі нашай краіны, няўхільна павышаецца матэрыяльны добрабыт працоўных. Совецкія людзі выканалі цяжкую задачу аднаўлення раёнаў, разбураных нямецка-фашысцкімі захопнікамі, дасягнулі і ў значных памерах пераўзышлі даваенны ўзровень развіцця народнай гаспадаркі.

Прыклад Совецкага Саюза натхняе працоўных краін народнай дэмакратыі, народы ўсіх краін у іх барацьбе за мір, дэмакратыю і соцыялізм.

Упершыню ў сваёй гісторыі скінуў ланцуты няволі вялікі кітайскі народ. Амаль трыццаць год комуністычная партыя Кітая кіруе вызваленчай барацьбой свайго народа. За гэтыя гады яна правяла многамільённыя масы працоўных Кітая праз усе цяжкасці барацьбы супраць імперыялізма і яго гаміндапаўскіх прыспешнікаў.

Па-новаму будуюць сваё жыццё працоўныя Германскай дэмакратычнай рэспублікі. Развіццё германскай дэмакратыі стварае ўмовы для аб'яднання Германіі ў адзіную дэмакратычную дзяржаву.

Полымя барацьбы супраць імперыялістычнай няволі, за мір і свабоду народаў усё мацней разгараецца ва ўсіх краінах, дзе яшчэ трымаецца ўлада капітала.

Пасляваенны перыяд з новай сілай паказаў, што толькі ў краіне соцыялізма магчымы сапраўдны росквіт гаспадаркі, рост матэрыяльнага і культурнага ўзроўню працоўнага народа. Капіталістычны свет не можа выбрацца з багны крызісу, а становішча працоўных там усё пагаршаецца. З кожным днём у капіталістычных краінах расце армія беспрацоўных, узмацняецца збяднение працоўных мас. У Злучаных Штатах Амерыкі армія беспрацоўных, якія зусім не маюць работы, або працуюць толькі часткова, складае каля 18 мільёнаў чалавек.

Совецкі Саюз ідзе на чале сіл, якія змагаюцца за лепшую будучыню працоўнага чалавека, якія змагаюцца за мір і бяспеку. Наш народ глыбока верыць у гэтыя сілы. Аднак ён не забывае пра небяспеку новай вайны, якую насуперак волі шырокіх народных мас падрыхтоўваюць і хочуць развязаць амерыканскія імперыялісты. На варце мірнай стваральнай працы совецкага народа пільна стаяць магутныя Узброеныя Сілы, пад сакрушальнымі ўдарамі якіх пяць год таму назад рухнуў германскі імперыялізм.

Наш народ хоча міру, ён узначальвае барацьбу за мір ва ўсім свеце. Кожны совецкі грамадзянін усёй душой ненавідзіць агрэсараў, ён ахоплены імкненнем працаваць, тварыць на славу сваёй Радзімы.

Мірныя імкненні нашага народа, яго нястрымнае жаданне аддаць усе свае сілы на будаўніцтва новага шчаслівага жыцця служылі і служаць зместам твораў совецкіх пісьменнікаў. Тэма працы з'яўляецца галоўнай у совецкай літаратуры. Нямала напісана кніг на гэтую тэму і нашымі беларускімі пісьменнікамі. Аднак разам з гэтым неабходна адзначыць, што тэмы барацьбы за мір, абароны нашай Радзімы павінны значна шырэй асвятляцца ў нашай беларускай літаратуры, ім павінна быць аддадзена галоўная ўвага.

З цвёрдай упэўненасцю глядзяць совецкія людзі ў свой заўтрашні дзень. Пад мудрым вядзіцельствам большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна паспяхова замацоўваюць яны вынікі сваёй гістарычнай перамогі, упэўнена ідуць па шляху да комунізма.

У СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ СССР

Аб выпуску Пятай дзяржаўнай пазыкі аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР

З мэтай прыцягнення сродкаў насельніцтва для далейшага развіцця народнай гаспадаркі СССР Совет Міністраў Саюза ССР пастанавіў:

1. Выпусціць Пятую дзяржаўную пазыку аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР на суму 20 мільярдаў рублёў тэрмінам на 20 год.

2. Аблігацыі пазыкі і выйгрышы па іх вызваліць ад абкладання дзяржаўнымі і мясцовымі падаткамі і зборамі.

3. Зацвердзіць прадстаўленыя Міністэрствам фінансаў СССР умовы выпуску Пятай дзяржаўнай пазыкі аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР.

Дзень большэвіцкага друку

38 год таму назад, па ўказанню Леніна, таварышам Сталіным быў падрыхтаваны і выпушчаны ў свет першы нумар газеты «Правда». Гэта было сапраўдным святам для рабочага класа, для ўсіх працоўных нашай краіны. У змроку ночы рускага царызма загарэўся яркі незгасальны светач праўды, якая, нягледзячы ні на якія перашкоды, пранікала ў гарадскія ўскраіны і ў заводскія гмахі—да рабочых, у казармы — да салдат і ў сялянскія хаты—да беднаты, уздымала іх на рэволюцыйную барацьбу за свабоду, супраць самадзяржаўя, паноў і капіталістаў.

Уся дзейнасць большэвіцкай «Правды» шчыльна звязана з гісторыяй нашай партыі, з яе гераічнай барацьбой за волю, за незалежнасць нашай краіны, за поўную перамогу соцыялізма. «З «Правдой» — гаворыцца ў «Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)», — расло цэлае пакаленне пролетарыята, які правёў потым Кастрычніцкую рэволюцыю». «Правда» паклала пачатак масаваму большэвіцкаму друку, таму друку, які стаў вестуном сусветнай праўды, які заняў пачэснае і баявое месца ў нашай краіне, трывала ўвайшоў у быт совецкіх людзей, стаў іх неабходнай духоўнай патрэбнасцю.

Выконваючы ленінскія запаветы і мудрыя ўказанні таварыша Сталіна, совецкі друк стаў самай вострай і магутнай зброяй нашай партыі, нашага народа ў барацьбе за перамогу комунізма.

Голас большэвіцкай праўды магутна гучыць на ўвесь свет, выкрываючы агрэсараў, натхняючы працоўных усяго свету на барацьбу за мір, дэмакратыю і соцыялізм.

Баявой задачай большэвіцкага друку з'яўляецца ўсямернае выкрыццё прошукаў ворагаў соцыялізма, барацьба з варожай нам ідэалогіяй рэакцыі і імперыялізма. Нам трэба памятаць словы таварыша А. А. Жданава: «Імперыялісты, іх цэйныя прыслужнікі, іх літаратары і журналісты, іх палітыкі і дыпламаты ўсяляк стараюцца нахлусіць на нашу краіну, прадставіць яе ў няправільным святле, нахлусіць на соцыялізм. У гэтых умовах задача совецкай літаратуры заключаецца не толькі ў тым, каб адказаць ударам на ўдары супраць усёй гэтай гнуснай хлусні і нападак на нашу совецкую культуру, на соцыялізм, але і смела бічаваць і нападаць на буржуазную культуру, якая знаходзіцца ў стане маразма і растлення».

Большэвіцкі друк з'яўляецца магутным сродкам шырокага разгортвання крытыкі і самакрытыкі. Мы павінны заўсёды памятаць указанні таварыша Сталіна: «Не адзначаючы і не выкрываючы адкрыта і сумленна, як гэта належыць большэвікам, недахопы і памылкі ў нашай рабоце, мы закрываем сабе дарогу наперад».

Крытыка і самакрытыка з'яўляецца адным з асноўных метадаў нашага друку. Карыстаючыся вострай зброяй крытыкі, совецкі друк выкрывае памылкі і недахопы ў працы дзяржаўных і грамадскіх устаноў і арганізацый, выкрывае няправільныя дзеянні паасобных людзей і вядзе рашучую барацьбу з усім тым, што перашкаджае нам рухацца наперад.

Большэвіцкі друк выхоўвае ў масах совецкі патрыятызм; нацыянальную гордасць народаў Совецкага Саюза, які стаў аплотам і абаронцам сусветнай цывілізацыі і прагрэса. Друк Совецкага Саюза рашуча змагаецца з праявамі нізкапаклонства і рабалепства перад гнілой буржуазнай культурай.

Галоўная задача нашага друку—гэта выхаванне працоўных у комуністычным духу, услаўленне новых рыс комунізма, якія нараджаюцца штодня. У вырашэнні гэтай велізарнай і пачэснай задачы асабліва вялікае значэнне належыць нашым пісьменнікам — інжынерам чалавечых душ. Неабходна, каб кожны совецкі пісьменнік прымаў самы актыўны ўдзел у перыядычным друку.

Совецкія пісьменнікі ствараюць высокаідэйную літаратуру для нашага народа. Яны дзеляць разам з ім свае радасці і ўдачы, ідуць разам з ім і ў мірнай стваральнай працы, і ў барацьбе супраць агрэсараў-імперыялістаў. Многія совецкія пісьменнікі ў салдацкім шынялю прайшлі баявы шлях разам з Совецкай Арміяй ад Сталінграда і Масквы да Берліна. Іх палымянае слова было на узбраенні нашай арміі, нашага народа.

Совецкія пісьменнікі заўсёды лічылі і лічаць працу ў газеце сваім грамадскім патрыятычным абавязкам перад Радзімай. Актыўны ўдзел пісьменнікаў у газеце адкрывае перад імі невычарпальныя магчымасці для творчага росту, для глыбокага пранікнення ў жыццё. Большэвіцкая газета для пісьменніка з'яўляецца школай дзяржаўнага вопыту, трыбунай, з якой ён вядзе размову з самым перадавым чытачом у свеце аб самых важных пытаннях сучаснасці. Але, на жаль, не ўсе нашы пісьменнікі надаюць гэтаму належнае значэнне.

У дзень свята большэвіцкага друку мы заклікаем усіх пісьменнікаў больш актыўна ўдзельнічаць у сваёй газеце, часцей выступаць на яе старонках па самых разнастайных пытаннях нашага жыцця.

Святкаванне Першага мая ў Мінску: Парад войск Мінскага гарнізона. Дэманстрацыя працоўных сталіцы.

Фота Г. Бугаенкі.

Першамайскі парад і дэманстрацыя працоўных на Краснай плошчы

Па-святочнаму выглядала сталіца нашай слаўнай соцыялістычнай Радзімы—Масква. Ва ўсіх 25 раёнах сталіцы яшчэ з самай раніцы сабраліся калоны дэманстрантаў, каб накіравацца на Красную плошчу і прадэманстраваць сваю бязмежную любоў і адданасць совецкай Радзіме, вялікай партыі Леніна—Сталіна, правадыру і настаўніку ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва таварышу Сталіну.

... Красная плошча. Насупраць ленінскага маўзалея — вялікія партрэты заснавальнікаў і правадыроў большэвіцкай партыі і совецкай дзяржавы В. І. Леніна і І. В. Сталіна, чырвоныя палотнішчы з заклікамі ЦК ВКП(б), дзяржаўныя гербы СССР і шаснаццаці саюзных рэспублік.

Уздоўж Крэмлёўскай сцяны на трыбунах — дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і саюзных рэспублік, Героі Совецкага Саюза і Героі Социялістычнай Працы, лаўрэаты Сталінскіх прэмій, праслаўленыя стаханаўцы, выдатныя дзеячы навукі, тэхнікі, мастацтва, генералы і адмі-ралы, афіцэры Совецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, партыйны, совецкі і профсаюзны актыў.

Наступае ўрачыстая цішыня. На трыбуну ленінскага маўзалея падымаецца Іосіф Вісарыёнавіч Сталін. Громам апладысментаў сустракаюць прысутныя з'яўленне вялікага правадыра і настаўніка.

Разам з таварышам Сталіным на трыбуну маўзалея падымаюцца таварышы В. М. Молатаў, Г. М. Маленкоў, Л. П. Берыя, К. Я. Варашылаў, А. І. Мікаян, Л. М. Кагановіч, Н. А. Булганін, А. А. Андрэеў, Н. С. Хрушчоў, А. Н. Касыгін, Н. М. Швернік, М. А. Суслаў, П. К. Панамарэнка, М. Ф. Шкіратаў.

Крэмлёўскія куранты б'юць дзесяць гадзін. Начальнік Генеральнага штаба Совецкай Арміі генерал Арміі С. М. Штэменка, закончыўшы аб'езд войск, звяртаецца з прамовай да воінаў Узброеных Сіл СССР, да совецкага народа, да замежных гасцей, якія прысутнічаюць на свяце.

Пачынаецца ўрачысты марш войск. Па ўстаноўленай традыцыі першымі ідуць выхаванцы ваеннай акадэміі імя М. В. Фрунзе. За ёй праходзіць Чырвонасцяжная ордэна Леніна ваенна-паветраная акадэмія імя Н. Е. Жукоўскага.

Над Краснай плошчай чуецца рокат матораў — пачынаецца паветраны парад.

Адначасова прадаўжаецца парад і на зямлі — па Краснай плошчы праходзяць воінскія часці.

... Ідуць калоны слухачоў Артылярыйскай акадэміі імя Ф. Э. Дзяржынскага, ваеннай ордэна Леніна акадэміі бронетанкавых і механізаваных войск імя І. В. Сталіна. Праходзіць зводны полк Ваенна-Марскога Флота.

Калону курсантаў Маскоўскага Чырвонасцяжнага вучылішча імя Вярхоўнага Совета РСФСР змяняюць калоны пяхотных часцей. За пяхотай прыгожым маршам праходзяць выхаванцы суваўскіх вучылішч і Ленінградскага Нахімаўскага вучылішча.

Пад гукі бадзёрага кавалерыйскага марша на плошчу ўступаюць эскадроны Чырвонасцяжнай вышэйшай афіцэрскай кавалерыйскай школы імя С. М. Будзённага і коннікі часці, якой камандуе тав. Літоўчанка.

На плошчы з'яўляюцца гвардзейцы стралковай Таманскай Чырвонасцяжнай ордэна Суворава дывізіі імя М. І. Калініна.

Затым пачынаецца марш сталінскай артылерыі... Праходзяць зянітныя ўстаноўкі, гвардзейскія мінамёты, супрацьтанкавая артылерыя. Усё новыя і новыя тыпы гармат з'яўляюцца на плошчы. Марш артылерыі прадэманстраваў магутнасць совецкай тэхнікі, майстэрства канструктараў і рабочых.

На плошчу ўступаюць танкі. Праходзіць гвардзейская Чырвонасцяжная ордэна Леніна Канцеміраўская танкавая дывізія.

Пасля ваеннага парада пачалася дэманстрацыя працоўных Масквы.

Сцяг Маскоўскага Совета, увенчаны ордэнам Леніна, праносіць старшы майстар завода «Калібр», дэпутат Вярхоўнага Совета СССР Мікалай Аляксеевіч Расійскі. Сцяг суправаджае група знатных людзей сталіцы.

... На плошчу ўступае калона піанераў. Хлопчык і дзяўчынка ўзбягаюць на трыбуну маўзалея і падаюць букеты кветак Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну і Вечаславу Міхайлавічу Молатаву.

Юныя дэманстранты ўрачыста вітаюць таварыша Сталіна, кіраўнікоў партыі і ўрада.

1200 сцягоў праносяць па плошчы сцяганосцы калон раёнаў сталіцы. За імі праходзіць 24-тысячная калона фізкультурнікаў, апранутых у рознакаляровую веснавую вопратку.

Небывалай па сваёй грандыёзнасці была дэманстрацыя працоўных Масквы.

Працоўныя дэманстравалі несакрушальнае маральна-палітычнае адзінства совецкага народа, яго гатоўнасць ісці наперад, да перамогі комунізма пад сцягам Леніна, пад валадзіцельствам Сталіна. Над калонамі былі высока ўзняты партрэты вялікіх правадыроў рэволюцыі, заснавальнікаў большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы В. І. Леніна і І. В. Сталіна.

Многія транспаранты і пано былі прысвечаны дасягненням краін народнай дэмакратыі, умацаванню магутнага фронта прыхільнікаў міру.

Сагрэтыя сталінскімі клопатамі, совецкія людзі прадэманстравалі сваё непахіснае імкненне змагацца за новыя поспехі ў социялістычным спаборніцтве, за датэрміновае выкананне народнагаспадарчага плана 1950 года, за няспынное павышэнне вытворчасці працы.

У сталіцы совецкай Беларусі

Мінск ў святочным убранні. Па адноўленых вуліцах і скверах праходзяць тысячы працоўных. Усе цэнтральныя вуліцы і плошчы заняты калонамі дэманстрантаў.

Пры ўваходзе на плошчу імя Леніна выстраіліся часці Мінскага гарнізона.

Роўна ў 11 гадзін раніцы на ўрадавую трыбуну ўзыходзяць: сакратар ЦК КП(б) Беларусі Н. І. Гусараў, старшыня Совета Міністраў БССР А. Е. Кляшчоў, старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР В. І. Казлоў, сакратар ЦК КП(б)Б тав. М. В. Зімянін, міністр Дзяржаўнай бяспекі БССР тав. Л. Ф. Цанава, сакратары ЦК КП(б)Б тав. В. І. Закурдаеў, В. А. Тамашэвіч, П. М. Брэнч, кіруючыя партыйныя і совецкія работнікі, генералы Совецкай Арміі.

Пасля ваеннага парада часцей Совецкай Арміі пачалася дэманстрацыя працоўных сталіцы рэспублікі.

Над калонамі працоўных — партрэты В. І. Леніна і І. В. Сталіна, членаў Палітбюро ЦК ВКП(б). Усюды відаць першамайскія заклікі ЦК ВКП(б). Кожная калона сваім афармленнем рапартавала аб працоўных поспехах, аб выніках перадмайскага социялістычнага спаборніцтва.

Дэманстрацыю адкрываюць працоўныя Сталінскага раёна.

Калона «Белтрактарабуда» нясе транспаранты, якія расказваюць аб перавыкананні вытворчай праграмы першых чатырох месяцаў 1950 года. Праходзіць калона рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў «Галоўмінскбуда». Гэта яны аднавілі цудоўную Совецкую і іншыя вуліцы, па якіх ідуць калоны дэманстрантаў. Калона станкабудаўнікоў завода імя Кірава расказвае аб сваіх працоўных поспехах. Каляктыў завода сустрэў дзень Першага мая каляктыўнай стаханаўскай вахтай.

У святочным убранні праходзяць рабочыя і служачыя многіх іншых прадпрыемстваў і ўстаноў сталіцы Беларусі. Чыгуначнікі, вучоныя, студэнты, будаўнікі, служачыя дзяржаўных устаноў, артысты, пісьменнікі, вучні рамесніцкіх вучылішч, фізкультурнікі — усе рапартуюць аб сваіх новых працоўных поспехах.

Дэманстрацыя працоўных Мінска з'явілася сведчаннем бязмежнай любві і адданасці беларускага народа таварышу Сталіну, большэвіцкай партыі і сваёй вялікай социялістычнай Радзіме.

Няспынна гучаць воклічы:

— Слава вялікаму Сталіну!

— Нашаму роднаму таварышу Сталіну ура!

У дэманстрацыі працоўных Мінска ўдзельнічала 200 тысяч чалавек.

Вечарам у парках, на вуліцах і плошчах адбыліся масавыя народныя гулянні.

Масавыя дэманстрацыі і народныя гулянні адбыліся таксама ва ўсіх абласных і раённых цэнтрах рэспублікі.

Мікола НАГНІБЕДА

ЗЯРНЯТЫ

Расянаю парою
На стане палявым
Усе касцы вячэраць
Сыйшліся па адным.

Агонь начны, як голуб,
Варкуе ў сіняве,
То згасне на хвіліну,
То зноўку ажыве.

Як хораша сыйсціся,
Калі гарыць агонь, —
І жарты, і ўспаміны,
І песня, і гармонь!

Касцы — хлапцы бывалыя,
Краса ўсяе зямлі —
Еўропу вызвалялі,
У Маньчжурыі былі.

Ад Сталіна падзяку
З іх мае не адзін
За Будапешт, Варшаву,
Сафію і Бярлін.

Пра ўсё касцы згадалі
Вясёлым часам тым,
Расянаю парою,
На стане палявым.

І пра Дунай шырокі,
Пра мужных у баю,
Пра Прагу урачыстую,
Пра гвардыю сваю.

Ёсць што сябрам і ў бітве
І ў мірны час згадаць...
Якія ў жніўні ночы
Духмяныя стаяць.

Снапы, нібы асілкі,
Паснулі на палях,
Далёкіх сёл сузор'і
Нанізаны на шлях.

Спяваюць малатарні,
Абуджаны такі...
Сябры ў паходзе марылі
Не раз пра час такі.

Прастор, як вокам кінуць,
Бясконцы, залаты,
Багацце краю роднага —
Жыты, жыты, жыты.

Пад полем ураджайным,
Як пояс, Млечны пуць!
Не спіць касец, спявае!
Ды й як яму заснуць!?..

— Ану, даволі песень, —
Азваўся камбайнер, —
Маё апавяданне
Паслухайце цяпер.

Вязалышчыцы падселі
І хлопцы — люба ўсім
Апавяданне слухаць
На стане палявым.

— У дні вайны Айчыннай,
Паходаў баявых,
Я ўзяў з калгаснай нівы
Зярнятаў залатых.

Чатыры жмені кінуў,
Сыпнуў у ранец свой,
Я іх бярог, як зброю,
Калі хадзіў у бой.

Не высахлі ад спёкі
Зярняты з нашых ніў,
У бойцы Сталінградскай
Агонь іх апаліў.

Калі мяне паранілі,
У грозны час вайны,
У ранцы набракалі
Маёй крывёй яны.

Не згінулі ў шпіталі,
Я ачуняў і зноў
Са зброяю і зернем
Аж за Дунай пайшоў.

Як родных, у Румыніі
Нас стрэлі беднякі.
Вузенькія ў іх нівы,
Як тыя рушнікі.

У вёсцы за Плаешці
Полк прыпыніўся наш.
Паклікаў мяне ў хату
Бядняк Раман Чадаш.

Яму аддаў зярняты я,
Сказаўшы так: — Бяры!..
Як шчасце мець жадаеш,
Пасей іх на зары.

Сабраў іх з ніў я вольных,
Калгасных, залатых,
Праз бітвы, праз навалы
Табе прынёс я іх...

І часта, часта дома
Мне снілася пасля:
Пад сонцам каласіцца
Румынская зямля.

Па ўсход схіліўся колас,
Хістае галавой,
Нібыта ўспамінае
Салдацкі ранец мой.

А што далей, вы знаеце...
Мы сеялі якраз —
З Румыніі сяляне
Прыехалі да нас.

Прыехалі — наведаць
Калгас вялікі наш,
Гляджу я... і не веру, —
Між іх Раман Чадаш.

Мы з ім расцалаваліся,
Як родныя браты.
«Ну, як жывеш?» — пытае.
— Як след, — кажу. — А ты?

«Прымі падзяку, — кажа, —
За дар вялікі, брат.
Твой дар на нівах новых
Памножыўся нашмат.

Багаццем за Дунаем
І шчасцем ён узрос
І славаю народа,
Што нам яго прынёс...».

...Задумаліся, слухаюць
Пры вогнішчы начным
Касцы парой расянай
На стане палявым.

Пераклаў з украінскай мовы
А. КУЛЯШОЎ.

Больш увагі прапагандзе беларускай літаратуры па радыё

Вялікай папулярнасцю ў радыёслухачоў карыстаецца чытанне па радыё літаратурных твораў. Побач з кароткімі апавяданнямі, навеламі, вершамі, паэмамі шырока практыкуецца «чытанне з працягам» вялікіх аповесцей, раманаў. Творы літаратуры пры дапамозе радыё робяцца здабыткам шырокіх мас. Жывы голас дзеячоў літаратуры даходзіць па радыёхвалях у самыя далёкія куткі нашай рэспублікі і за яе межы. Радыё рассунула сцены тэатраў, знаёмячы радыёслухачоў з лепшымі спектаклямі сталічнай сцэны. У пераводзе на друкаванае слова аб'ём літаратурна-драматычнага радыёвяшчання ў рэспубліцы складае 40—50 друкаваных аркушаў у месяц. Дасканалая совецкая радыётэхніка (у прыватнасці, запіс на магнітную плёнку, якім забяспечана большасць абласных радыёкамітэтаў) дазваляе рабіць здабыткам мільённай аўдыторыі літаратурны вечар, дыспут, выступленне абласнога тэатра, удзельнікаў мастацкай самадзейнасці і г. д.

Такі вялікі і разнастайны аб'ём радыёвяшчальнай работы патрабуе шырокага ўдзелу ў ёй нашай пісьменніцкай грамадскасці. Нам, работнікам совецкага радыёвяшчання, хацелася-б бачыць на старонках нашых газет прынцыповую, дзелавую крытыку той або іншай арыгінальнай радыёперадачы як з боку яе зместу, так і з боку формы.

Асаблівую патрэбу адчуваем мы ў адносінах крытыкі мовы і выканання радыёперадач. У друку часта гавораць аб моўных неахайнасцях у нашых пісьменнікаў, галоўным чынам стылістычнага парадку. Калі да гэтага дадаць, што выканаўца па радыё дадае да мовы твора яшчэ сваю неахайнасць, а такую неахайнасць можна сустрэць кожны дзень і ў сэнсе логікі, і ў сэнсе арфаэпіі, дык надчас атрымліваецца непрыстойны малюнак. І вось чамусьці ніводзін з нашых пісьменнікаў не лічыць сваім абавязкам напісаць ліст або выступіць у друку аб пачутых ім па радыё часам буйных агрэхах. Сярод мноства лістоў, якія атрымлівае Радыёкамітэт ад людзей самых розных катэгорый, не сустрэнеш ніводнага ад пісьменнікаў.

Крытыкі варта не толькі выкананне, але і змест асобных радыёперадач, асабліва публіцыстычнага і бібліяграфічнага характару. Гаворачы аб большасці перададзеных у мінулым годзе рэцэнзій на новыя творы нашай літаратуры, неабходна звярнуць увагу нашых крытыкаў на тую акалічнасць, што ў артыкулах усё яшчэ пераважае дух рэгістратараў навакольных падзей, а не баявы, наступальны дух большэвіка, які не можа абыякава, без усхваляванасці гаварыць аб стваральнай працы ў нашай краіне, аб тым, як воляй комуністычнай партыі пераўтвараецца аблічча нашай зямлі, аб тым, як палітычна і духоўна расце з кожным днём наш совецкі чалавек. Такая палымяная публіцыстыка асабліва неабходна літаратарам, якія супрацоўнічаюць у совецкім радыёвяшчанні, бо слова, выпушчанае ў эфір, як вядома, не ведае ніякіх межаў, ніякіх пагранічных візаў, і ад завостранасці гэтага слова, ад яго палымянасці залежыць, як далёка яно распаўсюдзіцца і як глыбока западзе ў душу совецкага або зарубежнага радыёслухача.

Дарэчы адзначыць, што рэспубліканскае літаратурнае радыёвяшчанне пакуль яшчэ не можа пахваліцца ні якасцю, ні колькасцю выступленняў нашых крытыкаў перад шырокай аўдыторыяй радыёслухачоў. Мала ў нас выступленняў, якія запальвалі-б масы, натхнялі-б іх на гераічныя працоўныя подзвігі на славу совецкай Радзімы.

Прычынай гэтаму трэба лічыць тое, што большасць нашых пісьменнікаў (і паэтаў, і празаікаў, і крытыкаў) недаацэньваюць радыёаўдыторыю, забываючыся, што гэта аўдыторыя непараўнальна шырэйшая за кола чытачоў любога рэспубліканскага часопіса ці газеты.

Наш народ глыбока цікавіцца літаратурай. У Радыёкамітэт дасылаюць свае лісты і рабочыя, і калгаснікі, і наша інтэлігенцыя, і хатнія гаспадыні, і школьнікі. Радыёслухачы называюць сваімі любімымі творамі галоўным чынам творы класікаў нашай літаратуры, творы рускай совецкай літаратуры, такія, як «Маладая гвардыя», А. Фадзеева, «Аповесць аб сапраўдным чалавеку» Б. Палявога, часам «Глыбокую плынь» І. Шамякіна, і амаль зусім не называюць новыя творы нашых пісьменнікаў, што з'явіліся ў друку летась, або над якімі яны працуюць цяпер. Значыць прапаганда беларускай совецкай літаратуры яшчэ не дасягнула сваёй мэты. І мне здаецца, што вялікая частка віны, акрамя Радыёкамітэта, кладзецца і на саміх пісьменнікаў, якія пагарджаюць мікрафонам.

З вялікімі цяжкасцямі прыходзіцца ўпрашваць нашых паважаных літаратараў, асабліва старэйшага пакалення, знайсці паўгадзіны часу, каб выступіць перад мікрафонам з новым вершам, апавяданнем, раздзелам паэмы або ўрыўкам з рамана ці аповесці, не кажучы ўжо аб спецыяльных формах літаратурных прац, якія патрэбны для радыё, — агляд новай кнігі, літаратурны мантаж на тую ці іншую тэму, надзённы радыёфельетон, радыёкампазіцыя, радыёп'еса, гутарка аб літаратуры, літаратурны агляд, літаратурны партрэт таго ці іншага пісьменніка і інш.

Зрабілася правілам прыносіць у рэдакцыю радыёвяшчання ў лепшым выпадку другі, а то і трэці пасабнік артыкула, нарыса, напісанага для друку. Гэтая непавага да радыёслухачоў тым больш прыкрая, калі параўнаць яе з той шчырай любоўю, з якой працавалі на радыё Янка Купала, Кузьма Чорны і іншыя пісьменнікі. З вялікай радасцю прыходзілі ў студыю радыёстанцыі «Совецкая Беларусь» у гады Айчыннай вайны Якуб Колас, Кандрат Крапіва, Пятрусь Броўка, Аркадзь Куляшоў, Максім Танк, Пімен Панчанка.

Мне здаецца, што кожны пісьменнік, працуючы над тым ці іншым буйным творам, павінен паставіць сабе за правіла знаёміць свайго чытача праз радыё з ходам сваёй працы, напрыклад—расказаць аб уражаннях аб творчай камандыроўцы і пасля гэтага прачытаць новы раздзел, у якім увасобіліся гэтыя ўражанні ў канкрэтныя літаратурныя вобразы.

Нашым крытыкам трэба шырэй скарыстоўваць радыётрыбуну для азнаямлення народа з навінкамі літаратуры, якая надчас доўга залежваецца на складах выдавецтваў і кнігагандлёвых арганізацый. Вельмі цікавымі для радыёслухача могуць быць і выступленні крытыкаў і літаратуразнаўцаў з гутаркамі, якія асвятлялі-б асноўныя праблемы совецкай літаратуры.

Час нашым паэтам, празаікам, драматургам узяцца за напісанне спецыяльных твораў для радыёвяшчання—вершаваных канферансаў да тэматычных канцэртаў, нарысаў, радыёэпартажаў, інсцэніраваных апавяданняў, радыёп'ес і г. д. Мог-жа, напрыклад, паэт Міхаіл Матусоўскі напісаць спецыяльна для радыё вершы, якія, разам з песнямі народаў свету, складаюць змест вельмі цікавай перадачы «Песня міру» для цэнтральнага радыёвяшчання.

Неабходна звярнуць увагу і на тую акалічнасць, што кожны з выступаючых па радыё пісьменнікаў павінен ставіцца да свайго выступлення з поўнай адказнасцю як за ідэйны, так і за мастацкі бок яго. Недапрацаваныя, наспех спечаныя творы не павінны мець месца ў радыёперадачах. Гэта ў асноўным датычыцца тых з нашых літаратараў, якія надчас безадказна стараюцца збыць на радыё тое, што сустракае адпор у рэдакцыі часопіса або газеты.

У задачу нашых крытыкаў павінна ўвайсці, нарэшце, асвятленне і разгляд у друку асобных перадач літаратурна-драматычнага радыёвяшчання, што дапаможа нам узняць на яшчэ больш высокую ступень якасць радыёперадач.

Зусім слушныя заўвагі былі зроблены І. Кудраўцавым у газеце «Совецкая Беларусь» адносна сур'ёзных недахопаў, якія былі і ёсць у літаратурна-драматычным радыёвяшчанні. Рэдакцыя прымае зараз захады, каб пашырыць кола аўтараў крытычных і літаратуразнаўчых перадач за кошт запрашэння для супрацоўніцтва на радыё вядомых крытыкаў.

З мая месяца ўведзены новы від літаратурнага радыёвяшчання — «Над чым працуюць пісьменнікі», які мае на мэце азнаямленне радыёслухачоў з творчымі планамі пісьменнікаў і творамі, якія знаходзяцца на іх рабочым стале.

Пры дапамозе шырокай пісьменніцкай грамадскасці Беларускі камітэт радыёінфармацыі даб'ецца павышэння ідэйна-мастацкага ўзроўню літаратурна-драматычнага радыёвяшчання ў рэспубліцы.

Ул. ЮРЗВІЧ,
галоўны рэдактар літаратурна-драматычнага радыёвяшчання.



Святкаванне Першага мая ў Маскве: 1. Парад войск Маскоўскага гарнізона. 2. Дэманстрацыя працоўных сталіцы.

Фотахроніка ТАСС.

Верны сын народа, друг совецкай літаратуры

(Да 5-й гадавіны з дня смерці А. С. Шчарбакова)

10 мая споўніцца пяць год з дня смерці аднаго з выдатных дзеячоў большэвіцкай партыі, вернага вучня і саратніка вялікага Сталіна, друга совецкай літаратуры—Аляксандра Сяргеевіча Шчарбакова.

Усё жыццё і дзейнасць А. С. Шчарбакова з'яўляюцца прыкладам беззаветнага служэння партыі Леніна—Сталіна і совецкаму народу, барацьбе за вялікую справу комунізма, за ўмацаванне магутнасці першай у свеце Совецкай дзяржавы.

Непахісны большэвік, для якога не было іншых інтарэсаў, чым інтарэсы партыі і народа, А. С. Шчарбакоў прайшоў слаўны жыццёвы шлях ад комсамольскага работніка да выдатнага дзяржаўнага дзеяча. Выхадзец з рабочай сям'і, ён ужо 12-гадовым хлапчуком пачаў самастойную працу, спачатку ў друкарні, а затым на чыгунцы. У дні Вялікага Кастрычніка ён у радах Чырвонай гвардыі змагаўся супроць ворагаў маладой Совецкай краіны. У 1918 годзе А. С. Шчарбакоў назаўсёды звязаў свой лёс з партыяй Леніна—Сталіна, 17-гадовым юнаком уступіўшы ў яе рады. Навучаючыся ў Свярдлоўскім комуністычным універсітэце, а затым у Інстытуце чырвонай прафесуры, А. С. Шчарбакоў паказаў прыклад адданасці вялікай партыі большэвікоў, узор непахіснай барацьбы за ўрачыстасць ідэй комунізма. Куды-б ні пасылала яго партыя—у Горкаўскую вобласць, ва Усходнюю Сібір, у Данбас—А. С. Шчарбакоў з чэсцю выконваў яе даручэнні, аддаючы ўвесь талент арганізатара і кіраўніка на здзяйсненне вялікіх планаў будаўніцтва соцыялізма.

У 1938 годзе А. С. Шчарбакоў быў выбраны першым сакратаром Маскоўскага гарадскога і абласнога камітэтаў ВКП(б). Сем год прапрацаваў ён на гэтым адказным і пачэсным пасту ў сталіцы нашай Радзімы пад непасрэдным кіраўніцтвам вялікага Сталіна. У гэты час асабліва ярка раскрылися большэвіцкія якасці А. С. Шчарбакова, які добра ведаў запатрабаванні народа, умеў апірацца на яго ў сваёй практычнай штодзённай дзейнасці.

З імем Шчарбакова звязаны вялікія дасягненні працоўных Масквы і вобласці ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве, у паспяховым ажыццяўленні сталінскай праграмы генеральнай рэканструкцыі сталіцы, у разгортванні соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва на фабрыках, заводах, на соцыялістычных палях вобласці. А. С. Шчарбакоў належаў да тых большэвікоў-арганізатараў, якія ўмеюць падпрадкаваць штодзённую працу вялікім мэтам агульнадзяржаўнага значэння, умеюць весці народ на здзяйсненне самых смелых, самых велічных мар. «Совецкі лад,—гаварыў ён, — ведае толькі адну заканамернасць—рух наперад і наперад».

На XVIII з'ездзе партыі А. С. Шчарбакоў быў выбраны членам Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), а ў 1941 годзе—сакратаром ЦК ВКП(б). У сваёй дзейнасці ён заўсёды браў прыклад з вялікіх Леніна і Сталіна, на прыкладзе іх жыцця і дзейнасці ён вучыў партыйных кіраўнікоў і радавых комуністаў заўсёды спалучаць сваю працу з інтарэсамі дзяржавы, быць палымянымі барацьбітамі са старым, аджыўшым, быць смелымі прапагандыстамі новага, таго, што нараджаецца і квітнее, таго, чаму належыць будучыня. «Не быць рутынёрамі,—гаварыў ён,—ламаць старыя нормы і традыцыі, калі яны ўстарэлі, замяняць іх новымі—такі абавязак кожнага леніна—сталінца.

Усяму гэтаму ў нас ёсць у каго вучыцца, у каго пераймаць.

Ва ўсім следаваць Леніну! Ва ўсім следаваць Сталіну! Ва ўсім быць такімі, як Ленін і Сталін!».

А. С. Шчарбакоў заўсёды напамінаў, што пабудова комунізма ў нашай краіне ва ўмовах капіталістычнага абкружэння патрабуе ўмацавання магутнасці Совецкай дзяржавы. Як верны сын народа, ён заўсёды змагаўся за эканамічны і культурны росквіт краіны, заклікаў умацоўваць яе ўзброеныя сілы, каб ніякія выпадковасці, каб ніякія прошукі імперыялістаў не маглі парушыць мірнага будаўніцтва совецкай краіны.

«Увесь гістарычны вопыт набудовы соцыялізма вучыць,—падкрэсліваў А. С. Шчарбакоў,—што пераход да комунізма ва ўмовах капіталістычнага абкружэння нельга ажыццявіць без таго, каб пастаянна не мацаваць магутнасці Совецкай дзяржавы».

У гады Вялікай Айчыннай вайны А. С. Шчарбакоў, працуючы сакратаром ЦК ВКП(б), МК і МГК ВКП(б), адначасова ўзначальваў Галоўнае палітычнае кіраўніцтва Совецкай Арміі і Совецкае Інформбюро. У цяжкія для Радзімы дні, калі фашысты пагражалі сэрцу краіны—Маскве, А. С. Шчарбакоў быў адным з бліжэйшых памочнікаў вялікага Сталіна ў здзяйсненні сталінскага стратэгічнага плана разгрому ворагаў пад Масквой. Маскоўскія большэвікі, згуртаваныя вакол большэвіцкай

партыі і таварыша Сталіна, ператварылі сталіцу ў баявы арсенал перамогі, аб які разбіліся зграі фашысцкіх захопнікаў. Многа сіл і энергіі аддаваў Шчарбакоў палітычнаму выхаванню совецкіх воінаў, вучыў іх, не ведаючы страху ў барацьбе, змагацца з ворагамі Радзімы.

Партыя і ўрад высока ацанілі заслугі вялікага сына совецкага народа. А. С. Шчарбакоў быў узнагароджаны трыма ардэнамі Леніна, ордэнам Суворава, ордэнам Кутузава, ордэнам Айчыннай вайны.

Для совецкіх пісьменнікаў імя А. С. Шчарбакова асабліва блізкае і дарагое. На Першым з'ездзе совецкіх пісьменнікаў ён выбіраецца адказным сакратаром праўлення Саюза. Гэта быў час пасля гістарычнай пастановы ЦК ВКП(б) ад 23 красавіка 1932 года. Увесь свой талент большэвіцкага арганізатара і кіраўніка ён аддае справе згуртавання совецкіх літаратараў, накіроўвае іх увагу на адлюстраванне ў высокаідэйных і высокамастацкіх творах гістарычных пераўтварэнняў, якія адбываліся ў краіне, на ўслаўленне совецкага чалавека—будаўніка і стваральніка. Імя А. С. Шчарбакова ў свядомасці совецкіх пісьменнікаў увасабляе сабой узор партыйнага кіраўніка, які ва ўсе галіны літаратурнага жыцця ўносіў большэвіцкую прынцыповасць, змагаўся з рэшткамі групаўшчыны, заўсёды ставячы на першы план інтарэсы партыі і народа. Разам з вялікім Горкім А. С. Шчарбакоў спрыяў сваёй нястомнай дзейнасцю з'яўленню многіх новых твораў, якія трывала занялі сваё месца сярод лепшых кніг совецкай літаратуры.

Клопаты аб росквіце літаратуры ставылі А. С. Шчарбакову непахісны аўтарытэт чулага і мудрага друга совецкіх пісьменнікаў. «Гэта быў вельмі блізкі мне чалавек, — успамінае Фёдар Гладкоў, — з якім я быў звязаны сапраўднай цёплай дружбай. Мы доўга і многа гутарылі з ім аб самых надзённых пытаннях літаратуры і абмяркоўвалі запаветныя мае замыслы. Ён званіў па тэлефону, іншы раз уночы, і даведваўся, як ідзе мая праца і ці не можа ён чымнебудзь дапамагчы. Я многім абавязаны яму ў стварэнні майго рамана «Энергія».

Выдатнай рысай А. С. Шчарбакова была чуласць да запатрабаванняў пісьменнікаў, гатоўнасць у любы момант прысці на дапамогу кожнаму літаратару ў яго творчай дзейнасці. «Шырокі дэмакратызм быў стылем працы Аляксандра Сяргеевіча, — успамінае Аляксандр Суркоў. — Дзверы яго рабочага пакою ў праўленні Саюза пісьменнікаў былі заўсёды шырока адкрыты для кожнага з нас. Гутарачы з Аляксандрам Сяргеевічам, адкрываючы яму ўсе свае перажыванні, або наракаючы на цяжкасці, або дзелячыся творчымі замысламі, кожны з пісьменнікаў, які прыходзіў да яго, ведаў і адчуваў, што размаўляе з другам, кроўна зацікаўленым у тым, каб спорылася творчая справа, з чалавекам, які глыбока ў добра пазнаў асаблівасці літаратурнай творчасці, пранік у тайнае тайных кожнага ілённа працуючага літаратара».

А. С. Шчарбакоў настойліва і клапатліва выхоўваў у асяроддзі пісьменнікаў непрымірымасць да недахопаў, вучыў з большэвіцкай прынцыповасцю ставіцца да сваёй творчасці і творчасці таварышаў. «Калі той або іншы пісьменнік рабіў ў сваёй творчасці або ў грамадскіх паводзінах няправільны крок, — працягвае А. Суркоў, — Аляксандр Сяргеевіч заўсёды гаварыў такому пісьменніку праўду ў вочы, не зважаючы на асобу і на становішча, якое той або іншы чалавек займае ў літаратуры. Гэтым ён праяўляў выдатную якасць большэвіцкай прынцыповасці, якая прасякала ўсю яго дзейнасць і ў нашай літаратурнай арганізацыі, і ва ўсіх галінах жыцця Совецкага Саюза, з якімі ён сутыкаўся».

А. С. Шчарбакоў патрабаваў ад мастацкай літаратуры, каб яна, услаўляючы гераічную сучаснасць, паказвала цудоўную будучыню, каб яна ўмела ўбачыць у сённешнім жыцці новыя, перадавыя рысы, якія зробяцца пануючымі заўтра. Ён вучыў пісьменнікаў даваць вялікія абагульненні, маляваць совецкіх людзей, для якіх «грамадскія інтарэсы зрабіліся іх асабістай справай... не шэрымі цьмянымі фарбамі», «смела, узнёсла, не паўзці за фактамі, а глядзець наперад, у заўтра».

У якасці выдатнага ўзору паэтычнага, узнёслага ўслаўлення будучыні ён ставіў творчасць лепшага таленавіцейшага паэта нашай совецкай эпохі Уладзіміра Маякоўскага, які ў дні інтэрвенцыі, разбурэння, голаду і холаду, здрад і змоў супроць маладой Совецкай краіны здолеў убачыць «за гарамі гора» яе заўтрашні «сонечны край непачаты».

Вялікую ўвагу аддаваў А. С. Шчарбакоў літаратурнай крытыцы, без якой немагчымы рост літаратуры. Падкрэсліваючы задачы крытыкі, вызначаючы яе характар, ён патрабаваў ад літаратурных крытыкаў, каб яны давалі ўсебаковы разгляд твораў, спалучаючы ідэйны аналіз з эстэтычным. «Крытыка павінна быць публіцыстычнай, навуковай, — вучыў А. С. Шчарбакоў, — павінна даваць палітычную, класавую ацэнку твора і адначасова — эстэтычнай, г. зн. даваць аналіз мастацкай сутнасці твора...». Пры гэтым крытыка павінна быць аб'ектыўнай, вольнай ад пабочных меркаванняў. Захвальванне слабых твораў, таксама як і знішчэнне або несправядлівая крытыка твораў, вартых увагі чытача, не можа прынесці карысці ні пісьменніку, ні чытачу. Крытыкі, якія «агульна зневажаюць адзін твор і гэтак-жа агульна захвальваюць другі», — нявартыя свайго высокага звання, бо «такая крытыка можа толькі дэзарыентаваць чытача і аўтара». Гэтыя ўказанні А. С. Шчарбакова дапамагалі і дапамагаюць зрабіць літаратурную крытыку вострай зброяй ў барацьбе за росквіт совецкай літаратуры і мастацтва.

Імя Аляксандра Сяргеевіча Шчарбакова, яго большэвіцкае служэнне Радзіме, партыі, народу, вялікай справе пабудовы комунізма ў нашай краіне ніколі не забудзе совецкі народ.

З НАМІ Ў СТРАЮ

«Самае дарагое ў чалавека — гэта жыццё. Яно даецца адзін раз і пражыць яго трэба так, каб, паміраючы, змог сказаць: усё жыццё і ўсе сілы былі аддадзены самаму галоўнаму на свеце — барацьбе за вызваленне чалавецтва».

Гэтыя хвалюючыя, глыбока праўдзівыя словы можна паставіць эпіграфам да кожнага твора, змешчанага ў кнізе «Мы іх не забудзем»*).

Мы не забудзем Хвядоса Шынклера, Алеся Жаўрука, Аркадзя Гейнэ, якія да апошняга дыхання абаранялі Сталінград; не забудзем Міколы Сурначова, што загінуў смерцю героя на подступах да Бярліна; Івана Шапавалава, чыё імя занесена на мемарыяльную дошку ў Цэнтральным Доме літаратараў у Маскве.

Мы заўсёды будзем помніць паэтаў: Андрэя Ушакова, Аляксея Коршака, Леаніда Гаўрылава, Алеся Дубровіча, Міколу Сямашку, Уладзіміра Рагуцкага, Сяргея Крыўца, Алеся Мілюця, Рыгора Жалезняка, Генадзія Шведзіка, Сямёна Ляльчука, Льва Талалая, Руву Рэйзіна. Іх не забудзе беларуская літаратура, не забудуць чытачы нашай краіны — іх саратнікі ў барацьбе з ворагамі і маладое пакаленне, у імя свабоды і шчасця якога яны смела і мужна ішлі ў бой.

Паэт Анатоль Вялюгін, які складаў зборнік, паставіў перад сабой высакародную задачу — у невялікай кнізе прадставіць творы загінуўшых таварышоў, творы, якія найбольш ярка і поўна раскрываюць аблічча гэтых пісьменнікаў. Сваю задачу Вялюгін выканаў, хоць яму можна кінуць папрок за празмерную скупасць у падборы матэрыяла для зборніка. Можна і патрэбна было прадставіць Хвядоса Шынклера не толькі яго выдатным нарысам «Пульс жыцця», у якім хвалююча паказаны патрыятызм нашых людзей, іх братняя дружба, любоў да Айчыны, але і больш раннімі творамі, такімі, як апавяданні «Апошні рэйс», «Блок», «Стрэлачнік Мігай». У гэтых апавяданнях Шынклер распрацоўваў вельмі мала закранутую ў беларускай прозе тэму чыгуначнага транспарту і, нягледзячы на некаторыя недахопы твораў, распрацоўваў настолькі цікава, з такім глыбокім веданнем матэрыялу і людзей, што апавяданні гэтыя нібыта напісаны ў нашы дні. Уключэнне іх у зборнік дазволіла-б з большай паўнатой паказаць творчы шлях пісьменніка, багацце яго літаратурнай мовы, яго ўменне ўвасабляць вобразы совецкіх патрыётаў.

Іван Шапавалаў быў сапраўдным песняром граніцы. Гэты гонар ён заваяваў сваімі апавяданнямі, вершамі, песнямі, раманам «Большэвікі граніцы». Зусім правільна зрабіў укладальнік кнігі, уключыўшы лепшыя ўрыўкі з рамана ў зборнік «Мы іх не забудзем». Па гэтых урыўках чытач знаёміцца з героем-пагранічнікам Лунгіным, які прайшоў вялікі слаўны шлях ад вясковага хлапца-батрака Андрэя да начальніка пагранічнай заставы. Жывымі ўстаюць перад чытачом і другія героі рамана — пагранічнікі Памагаеў, Ганчарэнка, Малышаў, Марных, Грунь і іншыя. Няма для іх вышэйшага абавязку, чым абавязак перад бацькаўшчынай, няма для іх іншых мэт, чым сумленнае служэнне Радзіме. Іван Шапавалаў здолеў паказаць гэтае пачуццё абавязкаў з асаблівай яркасцю, і ў гэтым—бясспрэчная ўдача аўтара. Але, акрамя рамана «Большэвікі граніцы», Іван Шапавалаў вядомы і як аўтар шматлікіх вершаў, песень, апавяданняў аб пагранічніках, і чытач меў права чакаць, што лепшыя з іх будуць змешчаны ў зборніку «Мы іх не забудзем». На жаль, укладальнік кнігі не зрабіў гэтага, і чытачу, які мала ведае Шапавалава, цяжка меркаваць аб разнастайнасці яго творчасці.

Аналагічныя заўвагі можна зрабіць і да большасці твораў іншых аўтараў, што ўключаны ў зборнік.

Выдавецтва правільна зрабіла, дапоўніўшы зборнік «Мы іх не забудзем» кароткімі ўступнымі артыкуламі пра пісьменнікаў. Артыкулы М. Лобана, К. Кірэенкі, А. Астапенкі, В. Таўлая, Я. Брыля, Р. Шырмы і Г. Рэлеса не абмяжоўваюцца толькі біяграфічнымі звесткамі, а раскрываюць творчы воблік паэтаў і празаікаў, расказваюць пра іх жыццёвы шлях. І таму тым больш недарэчна і для выдавецтва і для ўкладальніка, што такія артыкулы прысвечаны не ўсім аўтарам зборніка. Пра Алеся Жаўрука, Андрэя Ушакова, Аркадзя Гейнэ, Генадзія Шведзіка, Руву Рэйзіна пададзены толькі сцісłыя звесткі, кароткія анкетныя дадзеныя.

Нарыс Хвядоса Шынклера «Пульс жыцця» змешчаны ў зборніку без скарачэнняў. Ён прысвечаны жыццю совецкага тыла ў дні Айчыннай вайны, барацьбе работнікаў тэлеграфа за нашу перамогу над нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

«Я карыстаўся тэлеграфам, але ніколі не думаў пра яго людзей,—гаворыць адзін з персанажаў нарыса капітан Роо.—Тэлеграф для мяне быў чымсьці аддаленым, неадухоўленым... Я ўспрыймаў яго, як канкрэтны, але, даруйце мне, бяздушны механізм і—толькі».

А выйшла зусім не так. Тэлеграф—гэта перш за ўсё совецкія патрыёты, людзі з чыстай душой і вялікім сэрцам, актыўныя ўдзельнікі ўсенароднай барацьбы з ворагам.

Бясконцая плынь то радасных, то сумных паведамленняў праходзіць не толькі праз рукі, але праз сэрцы, праз душу тэлеграфістаў. Тым і вылучаюцца работнікі совецкага тэлеграфа ад усіх тэлеграфістаў свету, што для іх кроўна блізкім і дарагім з'яўляецца лёс кожнай нашай справы, кожнага совецкага чалавека. Героі нарыса не застаюцца абыякавымі да лёсу Яўгеніі Роо і яе дачкі, якія страцілі бацьку і мужа, да ленінградца Колесава, жонка якога павінна нарадзіць дзіця ў далёкім уральскім горадзе, да барацьбы калектыва алюміневага завода за павышэнне выпуску прадукцыі. Усё гэта непасрадна датычыцца іх, совецкіх тэлеграфістаў. Інакш яны не могуць, таму што яны адданыя сыны нашай вялікай і любімай Радзімы.

Нарыс Хвядоса Шынклера чытаецца з неаслабнай цікавасцю ад пачатку да канца. Яго мова—вобразная, маляўнічая і гранічна дакладная. Выдатнымі з'яўляюцца людзі, паказаныя аўтарам — сапраўдным майстрам мастацкага слова.

У зборніку шмат не менш змястоўных і хвалюючых вершаў, якія належаць пяру паэтаў-патрыётаў, загінуўшых у бойках з ворагам. Салдаты і афіцэры Совецкай Арміі горача любілі шчырыя вершы беларускіх паэтаў-франтавікоў. У першыя дні вайны адна з нашых танкавых брыгад пайшла ў бой з песняй, якую напісаў танкіст Леанід Гаўрылаў,—з песняй, што клікала совецкіх воінаў на пераможны бой з фашыстамі. Чытачы «Комсомольской правды» памятаюць мужныя вершы палітрука Ал. Сінічкіна (Алеся Жаўрука), якія часта з'яўляліся на старонках газеты.

З любімай Радзімай, з дарагой беларускай зямлёй у самыя напружаныя франтавыя дні быў усімі сваімі думкамі Мікола Сурначоў, які змагаўся з фашыстамі пад Сталінградам. Ёй, роднай краіне, прысвяціў ён свае лепшыя пачуцці. Паэт верыў, што зноў будзе яна шчаслівай і свабоднай:

Старонка мая, з дакорам
Ты сына свайго не кляні!
Мы пройдзем любімым борам,
Здабудзем твае кляны,
Хваёвыя пералескі,
Кветак мядзвяны пах.
Узняўшыя снег пралескі
Усцелюць прад намі шлях.

Палымяная любоў да жыцця, гарачая вера ў непахіснасць і мужнасць нашага народа—вось што характэрна для ўсіх паэтычных твораў, якія ўключаны ў зборнік «Мы іх не забудзем». І беларускі народ ніколі не забудзе сваіх адважных і верных сыноў, што аддалі жыццё за шчасце і свабоду соцыялістычнай Айчыны.

Ал. МІРОНАЎ.

*) «Мы іх не забудзем». Зборнік, прысвечаны памяці пісьменнікаў Беларусі, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Мінск, 1949 г.

Велічная тэма

Мяне заўсёды хвалявалі і хвалююць велічныя падзеі ў жыцці совецкага народа, асабліва тэмы перыяду грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

У свой час мною былі напісаны карціны: «Чапаеў», «Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск у 1920 годзе», «Парад партызан ў Мінску ў 1944 годзе», «Стаяць насмерць». Карціны «Чапаеў» і «Стаяць насмерць» з'явіліся пэўным творчым вопытам, які мне дапамагае цяпер працаваць над батальным творам «Абарона Брэсцкай крэпасці». Гэтая велічная тэма мяне хвалявала даўно. Яшчэ ў пачатку вайны, калі я даведаўся аб тым, як совецкія воіны да апошняга патрона абаранялі крэпасць, у мяне нарадзілася думка адлюстраваць іх подзвіг на мастацкім палатне.

Сваю працу над гэтым творам я пачаў з вывучэння матэрыяла. Перш-на-перш я прачытаў усё, што было надрукавана на гэтую тэму ў перыядычным друку. Гутарыў з удзельнікамі абароны, знаёміўся з матэрыяламі Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны (дакументы нямецкіх штабоў, успаміны партызан, фотаматэрыялы), сустракаўся з жыхарамі Брэста, якія былі сведкамі гістарычнай абароны. Перада мной раскрылася гераічная эпапея абароны крэпасці, гарнізон якой змагаўся дваццаць два дні.

... Вораг напаў знянацку. Першымі прынялі ўдар на сябе фарты, гарнізоны якіх гераічна змагаліся некалькі дзён. Калі крэпасць была абкружана, нямецкія фашысты пачалі ўводзіць цяжкую артылерыю, рабілі праломы ў сценах крэпасці цяжкімі снарадамі, пускаючы потым у праломы танкі. Супроць невялікага гарнізона (крыху больш палка) змагаліся тры дывізіі варожых войск, узброеныя навейшай тэхнікай. Нягледзячы на цяжкія ўмовы абароны (не было вады, абмежаваны запас харчоў і боепрыпасаў), совецкія воіны дзейнічалі па-геройску. Байцы падтрымлівалі сувязь з насельніцтвам Брэста, даставалі медыкаменты, атрымоўвалі звесткі аб ваенных падзеях і г. д. Нямецкае камандаванне надавала авалоданню крэпасцю вельмі вялікае значэнне, таму стаўка ўвесь час патрабавала любой цаной узяць яе. Нямецкае камандаванне паведамляла ў стаўку, што тут ідзе барацьба за кожны крок зямлі, за кожны камень, совецкія воіны абараняюць свае рубяжы не на жыццё, а на смерць. Аб гэтым сведчаць і надпісы совецкіх патрыётаў на сценах крэпасці: «Памрэм, але не здадзімся!», «За Радзіму!», «За Сталіна!» і г. д.

Пазнаёміўшыся падрабязна з эпапеяй абароны крэпасці па дакументах, я паехаў на месца падзей. Наведванне гэтага гістарычнага месца значна дапамагло мне ў выбары кампазіцыі майго будучага твора. На працягу двух месяцаў я пісаў эцюды гістарычных месц, усяго таго, што магло ў далейшым паслужыць матэрыялам у стварэнні задуманай мной карціны. Мною напісаны былі маслам эскізы: «Ільінскія вароты» (месца гарачых баёў), «Стык ракі Мухавец з перспектывай на Белы палац», дзе паказаны ландшафт руін, як сведчанне зацятых баёў, «Будынак клуба», дзе змяшчаўся цэнтральны штаб гарнізона крэпасці, «Тылавая частка Белага палаца», дзе ішлі гарачыя баі, «Уваход у клуб» — месца асабліва ўпартых баёў і г. д.

Змест маёй карціны прыблізна такі.

... Сцяна Брэсцкай крэпасці. Відаць мост. На пярэднім плане — воіны, якія вядуць ружэйна-кулямётны агонь. У цэнтры — фігура камандзіра, які перадае байцу гарнізонны сцяг. Сцяг — гэта сіла магутнасці нашай дзяржавы, гэта як-бы эстафета, якая пераходзіць з рук у рукі на працягу ўсяе абароны легендарных сцен Брэсцкай крэпасці. Да апошняга дыхання совецкі чалавек абаранае сцяг, абліты крывёю, прабіты кулямі, абпалены агнём. Навокала, па баках, параненыя, якія яшчэ вядуць бой, ля самых сцен сядзяць ужо цяжка параненыя, у глыбіні брамы — дзеці, жанчыны. І недзе на другім плане, дзе мост, паказаны вораг. Стаіць непамерная спёка, што робіць яшчэ цяжэйшым бой з пераўзыходзячымі сіламі ворага.

Я абраў гэты момант таму, што ён найбольш ярка адлюстроўвае гераізм совецкіх людзей, разам з тым ён паказвае ўсю веліч слаўных совецкіх воінаў, якія не скарыліся ворагам.

Я лічу, што тэма «Абарона Брэсцкай крэпасці» варта не толькі карціны, але і панарамы. У адным палатне цяжка паказаць усе важнейшыя моманты гэтых падзей. Пасля напісання карціны з групай беларускіх жывапісцаў я мяркую прыступіць да стварэння панарамы — «Абарона Брэсцкай крэпасці».

Эцюды гістарычных месц, дзе адбываліся важнейшыя баі, будуць экспанавіны ў Беларускім дзяржаўным музеі Вялікай Айчыннай вайны.

Тэма абароны Брэсцкай крэпасці ўсё больш і больш прыцягвае ўвагу нашых пісьменнікаў, дзеячоў кіно і тэатральнага мастацтва, якія з вялікай цікавасцю бяруцца за яе распрацоўку. У галіне жывапісу я ўпершыню спрабую выразіць гэтую велічную і разам з тым складаную тэму.

Суровыя муры Брэсцкай крэпасці былі сведкамі неаднаразовага нападу чужынцаў, але такая жорсткая барацьба, якая разгарэлася ў першыя дні Айчыннай вайны, тут адбывалася ўпершыню.

І сёння, у 5-ую гадавіну вялікай перамогі, мы ўспамінаем герояў, якія мужна змагаліся і аддалі сваё жыццё за шчасце совецкага народа.

Іх слава заўсёды будзе жыць у памяці нашага народа.

Я. ЗАЙЦАЎ,
заслужаны дзеяч мастацтва БССР

Усесаюзная выстаўка совецкай кнігі

На Усесаюзную выстаўку совецкай кнігі, якая адкрываецца ў Маскве ў сувязі з Днём друку, Кіраўніцтва паліграфічнай прамысловасці пры Совеце Міністраў БССР паслала звыш 200 назваў кніг, выпушчаных Беларускім дзяржаўным выдавецтвам у 1948—1950 гадах.

Сярод гэтых кніг цэнтральнае месца займаюць выдадзеныя на беларускай мове творы Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна.

На выстаўцы будуць таксама прадстаўлены творы на беларускай мове, якія прысвечаны таварышу Сталіну, работы кіраўнікоў партыі і ўрада, творы беларускіх пісьменнікаў, народныя песні аб вялікім правадыру.

Вялікае месца на выстаўцы займае мастацкая літаратура, у тым ліку творы лаўрэатаў Сталінскіх прэмій — «Новая зямля» і «Рыбакова хата» Якуба Коласа, «Комуністы» Аркадзя Куляшова, «Выбраныя творы» Янкі Купалы, кнігі Кастрычніцкай серыі і шмат іншых. На выстаўку накіравана таксама сельскагаспадарчая, навукова-тэхнічная і дзіцячая літаратура.

Мантаж стэнда беларускай кнігі на Усесаюзнай выстаўцы будзе праведзены пры непасрэдным удзеле беларускіх мастакоў.

У часе выстаўкі, якая прадоўжыцца месяц, мяркуецца наладзіць творчыя сустрэчы з мастакамі, пісьменнікамі, рэдактарамі, лепшымі паліграфістамі, а таксама са студэнтамі вышэйшых навучальных устаноў і вучнямі сярэдніх школ.

Выстаўка партызанскага друку

Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны да Дня большэвіцкага друку арганізаваў экспазіцыю на тэму: «Большэвіцкі падпольны друк у дні Вялікай Айчыннай вайны». Тут экспануюцца падпольныя цэнтральныя газеты, а таксама многатыражкі і насценныя газеты партызанскіх злучэнняў, брыгад і атрадаў. Побач з газетамі экспанаваны партатыўныя друкарскія машыны, паходныя касы і іншае абсталяванне партызанскіх друкарняў.

У дзень Перамогі над фашысцкай Германіяй у музеі адбудзецца масавы музейны дзень.

Работнікі літаратуры і мастацтва адзінадушна падпісаліся на Пятую дзяржаўную пазыку аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР

* * *

Плакат работы мастака В. Карэцкага. Фотахроніка ТАСС.

Сход пісьменнікаў Мінска

3 мая пісьменнікі горада Мінска сабраліся на агульны сход, прысвечаны выпуску Пятай дзяржаўнай пазыкі аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР.

З дакладам аб новай пазыцы выступіў пісьменнік П. Пестрак.

— Пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна,—гаворыць ён,— совецкі народ, перазадольваючы пасляваенныя цяжкасці, сваімі сіламі і сродкамі перавысіў даваенны ўзровень развіцця народнай гаспадаркі СССР. Сродкі насельніцтва, якія аддаюцца на пазыку, выкарыстоўваюцца для далейшага развіцця народнай гаспадаркі і культуры, для ўмацавання абароназдольнасці нашай краіны і служаць інтарэсам усяго народа. Нашы пазыкі з'яўляюцца народнымі пазыкамі.

Дакладчык заклікаў усіх пісьменнікаў адзінадушна падпісацца на новую пазыку.

Пісьменнікі П. Броўка, М. Лынькоў, Э. Агняцвет, М. Паслядовіч, Я. Брыль у сваіх выступленнях падкрэслілі выключнае значэнне дзяржаўных пазык у развіцці народнай гаспадаркі СССР і ў далейшым палепшанні добрабыту працоўных нашай краіны.

Пасля мітынга пачалася падпіска. Усе пісьменнікі з выключнай актыўнасцю дружна і арганізавана падпісаліся на Пятую дзяржаўную пазыку аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР.

Першымі падпісаліся Я. Колас, М. Лынькоў, П. Броўка, К. Крапіва, І. Гутараў і інш.

У работнікаў мастацтва

Роўна а шаснаццатай гадзіне каляктыў тэатра оперы і балета сабраўся каля радыёпрыёмніка. З вялікай увагай была праслухана пастанова Совета Міністраў СССР аб новай пазыцы. Пасля ўрадавага паведамлення адбыўся мітынг.

Першым выступіў сакратар партарганізацыі тэатра Нікіфаровіч. Ён сказаў:

— Выпуск Дзяржаўнай пазыкі ўвесь совецкі народ сустракае з выключным уздымам. Яна паслужыць далейшаму развіццю народнай гаспадаркі і сацыялістычнай культуры.—Тав. Нікіфаровіч заклікаў членаў каляктыва дружна падпісацца на новую пазыку.

Слова атрымаў народны артыст рэспублікі М. І. Дзянісаў.

— Совецкія людзі, — сказаў ён, — добра ведаюць, што нашы пазыкі павялічваюць магутнасць Радзімы. Таму з вялікай радасцю кожны совецкі грамадзянін пазычае дзяржаве свае зберажэнні. Патрыятычная згуртаванасць вакол партыі і ўрада, якую зноў дэманструе совецкі народ, разам з тым з'яўляецца грозным папярэджаннем падпальшчыкам новай вайны.

З вялікім натхненнем на мітынгу выступілі лаўрэаты Сталінскіх прэмій — народная артыстка БССР А. Нікалаева і мастацкі кіраўнік балета К. Мулер, а таксама канцэртмайстра тэатра О. Русіян.

Пасля мітынга пачалася падпіска, якая прайшла дружна і арганізавана.

* * *

Мітынг, прысвечаны падпісцы на Дзяржаўную пазыку адбыўся ў каляктыве сімфанічнага аркестра Беларускай Дзяржаўнай філармоніі. З палымянымі прамовамі на мітынгу выступілі: заслужаны дзеяч мастацтва БССР, мастацкі кіраўнік філармоніі Я. Цікоцкі, артыст аркестра Я. Гедыльтэр і дырэктар філармоніі Г. Прагін. Яны заклікалі каляктыў артыстаў арганізавана падпісацца на новую пазыку. Да пяці гадзін 3-га мая падпіска была закончана.

* * *

Ля рэпрадуктараў сабраліся выкладчыкі і студэнты тэатральнага інстытута, работнікі Рэспубліканскага Дома народнай творчасці, Белдзяржэстрады, якія з вялікай увагай праслухалі ўрадавае паведамленне пра выпуск новай пазыкі. Кожны з прысутных выканаў свой патрыятычны абавязак, пазычыўшы дзяржаве свае зберажэнні.

* * *

Мітынг, прысвечаны новай пазыцы, адбыўся ў Маладзечанскім абласным ансамблі песні і танца, які цяпер знаходзіцца ў Мінску. На працягу адной гадзіны ўсе артысты ансамбля арганізавана падпісаліся на новую пазыку.

* * *

Патрыятычны ўздым

Адразу пасля таго, як радыё паведаміла аб пачатку падпіскі на Пятую дзяржаўную пазыку аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР, беларускія мастакі сабраліся на мітынг.

Мітынг адкрыў сакратар партыйнай арганізацыі Саюза совецкіх мастакоў П. Гаўрыленка.

— Карысць пазыкі нам вядома, — гаворыць ён. — На прыкладзе нашай рэспублікі мы бачым, куды ідуць дзяржаўныя сродкі. Сталіца нашай рэспублікі ператварылася са звычайнага горада ў індустрыяльны цэнтр. Мінск змяніў сваё аблічча. Выраслі буйныя заводы з новымі рабочымі пасёлкамі.

Тав. Гаўрыленка заклікае беларускіх мастакоў дружна падпісацца на пазыку.

* * *

Усе работнікі кіностудыі «Беларусьфільм» з вялікай радасцю сустрэлі пастанову Совета Міністраў СССР аб выпуску Пятай дзяржаўнай пазыкі аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР і дружна правялі падпіску.

* * *

Арганізавана прайшла падпіска на пазыку сярод беларускіх кампазітараў. Ад шчырага сэрца аддалі яны свае асабістыя зберажэнні дзяржаве, падпісаўшыся на пазыку, накіраваную на ўмацаванне пасляваеннай эканомікі і ваеннай магутнасці нашай краіны, на хутчэйшае залечванне ран, нанесеных вайной, і на больш хуткі рост нашай прамысловасці, сельскай гаспадаркі, навукі і культуры.

* * *

Сведчаннем высокіх патрыятычных пачуццяў з'явілася дружная падпіска на Пятую дзяржаўную пазыку аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР сярод выкладчыкаў і студэнтаў кансерваторыі, музычнай школы і вучылішча.

Праз некалькі гадзін пасля абвяшчэння пастановы Совета Міністраў СССР падпіскай на пазыку былі ахоплены ўсе работнікі кансерваторыі, музычнага вучылішча, музычнай школы і музычнай школы-дзесяцігодкі.

* * *

Горача адгукнуўся на пастанову ўрада аб выпуску новай пазыкі каляктыў тэатра імя Я. Купалы.

На мітынгу, прысвечаным падпісцы на пазыку, выступіў заслужаны артыст БССР С. Бірыла, народны артыст БССР Ул. Дзядзюшка, народны артыст БССР Ул. Уладамірскі і інш. Усе выступаючыя гаварылі аб гатоўнасці совецкага народа дапамагчы роднай дзяржаве сваёй адданай працай і сваімі сродкамі будаваць комуністычнае грамадства і мацаваць абароназдольнасць совецкай Радзімы.

Каляктыў тэатра поўнасцю ахоплены падпіскай на пазыку.

З такім-жа поспехам падпіска на новую пазыку прайшла і ў Рускім драматычным тэатры БССР.

Падпіска на пазыку ў тэатры імя Я. Купалы

Фота Г. Бугаенкі.

Карысны падручнік

Па падручніку элементарнай тэорыі музыкі пачынае сваё знаёмства з асновамі музычнай навукі і прафесіянал, і аматар, і член самадзейнага музычнага гуртка. Чым шырэй кола наведвальнікаў канцэртаў, чым большую колькасць слухачоў прыцягваюць музычна-адукацыйныя перадачы па радыё, чым гусцей сетка музычных школ, вучылішч і курсаў — тым мацней адчуваецца патрэбнасць у такім пачатковым падручніку.

Асаблівасцю падручніка з'яўляецца тое, што ён не абмяжоўваецца вывучэннем адной вызначанай галіны музыкі, як напрыклад падручнік паліфаніі або гармоніі, але дае ключ да паступовага авалодвання ўсімі раздзеламі музычнай навукі. Знаёмячы з пачаткамі музычнай граматы — чытаннем нот, вызначэннем іх працягласці, назвамі актаў — падручнік у той-жа час у даступнай форме павінен даць уяўленне аб вельмі складаных рэчах, якія толькі ў далейшым могуць быць ахоплены поўнасцю, напрыклад аб ладавай арганізацыі гукаў або чляненні музычнай мовы. Такім чынам, падручнік павінен коратка, элементарна асвятліць увесь шырокі працэс музычнай творчасці.

Натуральна, што іменна з прычыны складанасці і адказнасці задач добры падручнік элементарнай тэорыі музыкі— з'ява рэдкая. Совецкія педагогі Паўлючэнка, Кулакоўскі і Кісялеў даўно ўжо адмовіліся ад вузка-школьных рамак. Асвятляючы ўсё больш шырокае кола пытанняў, прыцягваючы разнастайны ілюстрацыйны матэрыял, яны змаглі адгукнуцца на запатрабаванні совецкага чытача.

Да такога-ж новага тыпу пачатковых падручнікаў належыць і падручнік элементарнай тэорыі В. Яфімава, выпушчаны Дзяржаўным выдавецтвам БССР. Аўтар імкнуўся не толькі асвятліць асноўныя палажэнні музычнай навукі, але і паказаць іх жывую сувязь з музычнай творчасцю. Адсюль вялікая колькасць прыкладаў — народных песень і ўрыўкаў з музычных твораў, — якія ілюструюць практычнае значэнне выкладзенага матэрыялу. Уважліва паставіўся аўтар і да музычнай тэрміналогіі, стараючыся не фармальна пазнаёміць з ёй вучняў, а даць уяўленне аб тым, як з'явіўся той або іншы тэрмін і ў якой сувязі з практычным творчым вопытам.

Шырэй, чым звычайна, разгорнуты і некаторыя важныя раздзелы, якія падводзяць да вывучэння гармоніі і аналізу твораў. Гэтыя раздзелы, у асаблівасці вывучэнне сінтаксіса музычнай мовы, даюць магчымасць на жывым прыкладзе ўявіць узаемадзеянне тых элементаў музыкі, якія ў папярэдніх раздзелах вывучаліся асобна.

Праўда, у выніку паглыблення гэтых раздзелаў, атрымалася некаторая перагрузка матэрыялам, якая непажадана для пачатковага падручніка. Яўна перагружаны, напрыклад, раздзел гармоніі. Улічваючы цяжкасці, якія ўзнікаюць перад вучнем у практычным засваенні гэтага раздзела, аўтар даў эканомныя, канкрэтныя тлумачэнні, якія ўказваюць, як гэтыя цяжкасці пераадолець.

Такім-жа чынам прыходзіць ён на дапамогу вучням і педагогу ў справе аназнання ключавых знакаў або хуткага вызначэння мінорных танальнасцяў, што для многіх пачынаючых музыкантаў з'яўляецца складанай справай. І ў гэтым і ў радзе іншых выпадкаў В. Яфімаў падказвае тую або іншую канкрэтную прыкмету, якая павінна дапамагчы вучням справіцца са сваёй задачай. Гэтымі прыкметамі можна карыстацца або не, але яны несумненна прымусяць удумлівага педагога шукаць спосабу для больш рацыянальнага засваення ведаў.

Усе прыведзеныя аўтарам прыклады з музычнай літаратуры таксама наглядна і пераканаўча пацвярджаюць палажэнні, якія выказаны ў тым або іншым раздзеле. Бясспрэчнай каштоўнасцю падручніка з'яўляецца і тое, што аўтар шырока карыстаецца прыкладамі з народнай беларускай песні. Большасць прыкладаў выбрана не толькі з улікам іх матэзгоднасці, але і з улікам іх шырокай папулярнасці. На прыкладзе знаёмай мелодыі вучні лепш засвояць матэрыял.

Натуральна, што падручнік, які ставіць перад сабой новыя метадычныя задачы, не пазбаўлены і недахопаў. Да іх ліку можна аднесці празмерную лаканічнасць адных фармуліровак і недастатковую выразнасць, а то і спрэчнасць другіх (вызначэнне танальнасці, вызначэнне інтэрвала), часам некаторую шарахаватасць стылю, недакладнасць слоўніка («строй гукарада»). У кнізе ёсць друкарскія памылкі (ключ соль аказаўся змешчаным на першай лінейцы). Усё гэта павінна быць выпраўлена пры наўторным выданні, якое трэба зрабіць чым хутчэй, бо падручніка ўжо і цяпер немагчыма дастаць не толькі ў межах Беларусі, але і ў іншых гарадах Саюза.

Для таго, хто самастойна вывучае тэорыю музыкі, і, асабліва, для маладых настаўнікаў, якія выкладаюць гэты прадмет, падручнік В. Яфімава з'яўляецца сур'ёзным дапаможнікам.

Я. ЧОРНАЯ,
кандыдат мастацтвазнаўчых навук.

НОВЫЯ КАРЦІНЫ

Дзяржаўная карцінная галярэя БССР напоўнілася новымі каштоўнымі творамі рускага жывапісу. Набыты новыя палотны Г. Чарняцова «Храм Шота Руставелі», К. Макоўскага «Балгарскія мучаніцы» (XIX стагоддзе), К. Лебедзева — карціна на гістарычную тэму аб Іване Грозным і інш.

За апошні час значна павялічылася колькасць наведвальнікаў галярэі.

Новы ілюстраваны часопіс

Выйшаў першы нумар штомесячнага грамадска-палітычнага часопіса «Совецкі Саюз», які выдаецца замест часопіса «СССР на стройке».

У нумары надрукаваны фотанарысы пра Горкаўскі аўтамабільны завод імя В. М. Молатава, пра жыццё і працу жанчын Совецкага Таджыкістана, пра дасягненні абхазскага калгаса імя Леніна, пра подзвігі хлебаробаў горнага Алтая і інш.

Часопіс багата ілюстраваны. Каляровыя фота расказваюць пра падземныя палацы Маскоўскага метро. Кадры з выдатных совецкіх кінофільмаў «Браненосец «Пацёмкін», «Чапаеў», «Ленін у 1918 годзе», «Дэпутат Балтыкі», «Сталінградская бітва», «Падзенне Бярліна» і многіх іншых ілюструюць вялікія поспехі совецкай кінематаграфіі.

Часопіс выдаецца ў прыгожым мастацкім афармленні на рускай, кітайскай, англійскай, французскай, нямецкай і іспанскай мовах. Аб'ём кожнага нумара— 10 друкаваных аркушаў, цана — 6 рублёў.

„Полымя" № 3

Выйшаў з друку трэці нумар штомесячнага літаратурна-мастацкага часопіса «Полымя». У часопісу надрукаваны новыя вершы М. Танка, М. Калачынскага, Э. Агняцвет, А. Іверса, В. Матэвушава, Д. Сасева, М. Васілька і П. Пранузы, а таксама нізка вершаў Аляксандра Пракоф'ева «Слова аб Радзіме» ў перакладзе П. Панчанкі і Ул. Шахаўца.

З празаічных твораў у нумары надрукавана заканчэнне першай кнігі раману «Мінскі напрамак» Івана Мележа, апавяданні: Івана Шамякіна «Сялянка» і Я. Шарахоўскага «Срэбраная раніца». Акрамя гэтага ў часопісу надрукавана п'еса А. Кучара «Гэта было ў Мінску» і нарыс А. Бажко «На новым шляху».

У раздзеле крытыкі і публіцыстыкі змешчаны артыкул Ул. Карпава «Проза 1949 года». Бібліяграфія ў нумары прадстаўлена рэцэнзіяй А. Есакова на кнігу І. Гутарава «Барацьба і творчасць народных мсціўцаў» і рэцэнзіяй А. Вялюгіна на зборнік вершаў М. Калачынскага «Сонца ў блакіце».

Размова аб песні

Совецкі народ хоча спяваць прыгожыя песні аб сваім шчаслівым сацыялістычным жыцці. У стварэнні такіх песень беларускія кампазітары маюць пэўныя поспехі. Можна назваць такія творы, як «Песня аб Сталіне» М. Аладава (словы А. Русака), «Бывайце здаровы» і «Песня беларускіх партызан» І. Любана (словы А. Русака і П. Броўкі), «Мы—беларусы» і «Комсамольская» Н. Сакалоўскага (словы М. Клімковіча і М. Гамолкі), «Песня аб Даватару» і «Песня аб Заслонаве» Ул. Алоўнікава, «Песня аб трактарным» Д. Лукаса (словы А. Астрэйкі), песні народнага артыста БССР М. Чуркіна, кампазітара П. Падкавырава і інш. Значная частка гэтых твораў увайшла ў быт народа і шырока вядома за межамі Беларусі. Гэты поспех тлумачыцца тым, што ў песнях ёсць пачуццё новага, жыццерадасны настрой совецкага чалавека.

Цвёрды рытмічны поступ валявой мялодыі «Песні аб Сталіне» М. Аладава, «Мы — беларусы» Н. Сакалоўскага, «Песні аб Даватару» Ул. Алоўнікава ўваскрашае ў памяці лепшыя гераічныя народныя мялодыі грамадзянскай вайны і Вялікай Айчыннай вайны. «Песня аб Заслонаве» Ул. Алоўнікава хвалюе слухачоў сваёй лірычнай мялодыяй, якая стварае вобраз любімага ў народзе легендарнага героя партызанскай барацьбы.

Ул. Алоўнікаў добра ведае ваенны фальклор, салдацкі быт, і гэта дапамагло яму напісаць некалькі добрых па сваёй меладычнай выразнасці песень, якія ўвайшлі ў рэпертуар салдацкай мастацкай самадзейнасці і з поспехам выконваюцца ансамблем песні і танца Совецкай Арміі імя Аляксандрава.

Аднак, трэба канстатаваць значнае адставанне беларускіх кампазітараў у напісанні масавай песні. І да гэтага часу няма добрых песень аб героях сацыялістычнай працы. Было-б несправядліва сцвярджаць, што беларускія кампазітары зусім не звяртаюцца да тэмы сацыялістычнай працы. Але тут, на жаль, пераважаюць творчыя няўдачы. Калі выключыць даволі цікавую па мялодыцы «Песню аб трактарным» Д. Лукаса, дык іншыя творы маюць той недахоп, што мялодыка іх надуманая. Напрыклад, у песні М. Аладава «Лепшым аддадзім наш голас» мялодыя малавыразная і штучная. У песні «Лён» Р. Пукста добрая сама па сабе мялодыя не адпавядае бадзёраму, жыццёрадаснаму настрою народнага тэкста.

Некаторым песням нашых кампазітараў нехапае хвалюючага пачуцця і ўзнёсласці. У нейкай ступені віна тут ляжыць і на паэтах, тэксты якіх падчас або вельмі празаічныя або маюць элементы натуралізма. У прыватнасці, грашаць бытавізмам асобныя тэксты А. Русака і Э. Агняцвет, і некаторыя кампазітары замест таго, каб прыўзняць тэкст, раскрыць яго паэтычны настрой, ствараюць шэрыя мялодыі, у якіх няма цеплыні і сардэчнасці.

Да гэтага часу беларускія кампазітары не змаглі напісаць ніводнай удалай страявой песні. Добрую ініцыятыву ваеннай секцыі Саюза кампазітараў па наладжванню творчых сустрэч з ансамблем песні і танца Беларускай ваеннай акругі трэба ўсямерна вітаць, але на жаль і тут за апошні час наступіла цішыня.

Няма яшчэ песень і аб новым калгасным быце, аб сацыялістычнай працы. Тут беларускія кампазітары далёка адсталі ад беларускай паэзіі. Нашы кампазітары наогул недастаткова ведаюць і вывучаюць паэзію, не знаёмяцца сур'ёзна і глыбока з творчасцю Янкі Купалы і Якуба Коласа. Мала таксама вывучаюць яны творы П. Броўкі, П. Глебкі, А. Куляшова, М. Танка і іншых паэтаў, і таму часам з'яўляюцца песні з нізкаякасным паэтычным тэкстам.

Да гэтага часу няма сапраўднага творчага садружаства паэтаў і кампазітараў. На творчых дыскусіях у Саюзе кампазітараў паэты вельмі рэдкія і выпадковыя госці.

Была-б карыснай для нашых кампазітараў жывая сувязь з народнымі паэтамі-песеннікамі, якія пішуць аб новым калгасным жыцці. Яны ёсць у кожным калгасным хоры на Палессі, Магілёўшчыне, Гродзеншчыне і іншых абласцях Беларусі.

Кампазітарам не шкодзіла-б таксама сваімі вачыма ўбачыць велізарнейшыя пераўтварэнні, якія адбыліся ў вёсцы, адчуць дыханне новага калгаснага жыцця.

Трэба гаварыць і аб лірычнай песні. Кампазітары не змаглі глыбока выкарыстаць багатую спадчыну беларускай народнай лірычнай мялодыі, каб стварыць хвалюючую лірычную песню.

Беларускія кампазітары ў садружастве з паэтамі напісалі рад песень гераіка-эпічнага складу, песень гімнічнага характару. Аднак, выдатных песень, якія былі-б падхоплены ўсім народам, у нас створана мала. Тут можна назваць песні Н. Сакалоўскага «Мы—беларусы» і «Комсамольская», «Песні беларускіх партызан» І. Любана, «Песня аб Даватару» Ул. Алоўнікава, «Беларускія партызаны» П. Падкавырава. У астатніх песнях адчуваецца абязлічаная і мала арыгінальная мялодыка. Гэта тлумачыцца тым, што некаторая частка кампазітараў не ўзбагачае сваю мелядычную мову новымі інтанацыямі, а жыве запасам архаічных інтанацый старой дарэволюцыйнай песні.

Праблема стылю беларускай масавай песні набывае асаблівае значэнне ў святле тых вялікіх патрабаванняў, якія прад'яўляе совецкі народ да творчасці кампазітараў. Нельга ствараць масавую песню ў адрыве ад яе нацыянальнай асновы. Заслуга І. Любана ў тым, што яму ўдалося на аснове не наогул нацыянальных песенных інтанацый, а на аснове актыўных і бадзёрых меладычных папевак раскрыць сучасныя настроі совецкіх людзей. У песні «Бывайце здаровы» кампазітару ўдалося нанава пераасэнсаваць любімыя народныя інтанацыі і стварыць песню, сугучную настроям совецкага чалавека.

Пытанні стылю беларускай совецкай песні, пытанні сацыялістычнага рэалізма ў творчасці беларускіх кампазітараў павінны прыцягнуць увагу ўсёй музычнай грамадскасці.

Адставанне ад жыцця беларускай песні мімаволі прымушае падумаць аб дзейнасці рэпертуарнай камісіі Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР, праца якой яшчэ далёка не на высокім узроўні. Суб'ектыўныя разважанні асобных членаў камісіі, а яшчэ часцей павярхоўная крытыка часта прыводзяць да няправільнай ацэнкі песень. Камісія да гэтага часу не здолела падтрымаць выдатнае пачынанне заслужанага дзеяча мастацтва Г. Цітовіча па прапагандзе ў харавых каляктывах совецкай народнай песні.

Рэпертуарная камісія, як і ўсе музычныя ўстановы, якія закліканы прапагандаваць песенную творчасць кампазітараў, павінны больш актыўна ўзяцца за гэтую справу. Вялікую дапамогу мог-бы аказаць конкурс на масавую песню. Добра арганізаваны конкурс паслужыў-бы выдатным стымулам для кампазітараў і паэтаў і значна дапамог-бы ім у стварэнні масавай беларускай песні. Такія песні, як «Бывайце здаровы», «Мы—беларусы» і іншыя ўзніклі ў выніку конкурсаў на масавую песню.

Стаяць у баку ад прапаганды песні часопісы «Беларусь», «Работніца і сялянка», «Бярозка», газеты «Зорька», «Піонер Беларусі», «Чырвоная змена», «Сталінская молодёжь» і іншыя, якія маглі-б сістэматычна друкаваць песні. Дарэчы, газета «ЛіМ», якая ў мінулым друкавала на сваіх старонках песні, чамусьці адмовілася ад гэтай добрай традыцыі.

Слаба прапагандуюцца песні музычнай рэдакцыяй Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі. Хіба нельга арганізаваць выпуск лістовак з масавым тыражом па прыкладу Масквы і Ленінграда, выдаваць асобныя зборнікі песень на словы Янкі Купалы, Якуба Коласа, П. Броўкі, А. Русака, А. Астрэйкі? Можна знайсці яшчэ і іншыя шляхі прапаганды песні, толькі трэба гэта рабіць з любоўю і разумець, што прапаганда песні — вялікая дзяржаўная справа.

На жаль, да гэтага часу быў нескарыстаным адзін з самых магутных фактараў прапаганды песні — кіно. У Беларусі сістэматычна выпускаюцца на экраны кінатэатраў кароткамятражныя фільмы, кіночасопісы, але ў іх рэдка можна сустрэць беларускую песню і мялодыю. Творчая сувязь кампазітараў з дзеячамі кіно значна дапамагала-б прапагандзе новых беларускіх совецкіх песень.

Усе гэтыя пытанні павінны быць у цэнтры ўвагі творчай дзейнасці Саюза кампазітараў БССР.

Б. СМОЛЬСКІ.

Галоўны рэдактар М. ГОРЦАЎ.
Рэдкалегія: М. БЛІСЦІНАЎ, В. ВІТКА — нам. галоўнага рэдактара, М. КАЦАР, П. ПАДКАВЫРАЎ, П. ПАНЧАНКА, М. ПАСЛЯДОВІЧ, Я. РАМАНОВІЧ, К. САННІКАЎ.

АТ 00050. Друкарня «Чырвоны Друкар», г. Мінск, Рэволюцыйная, 12. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Совецкая 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара 2-31-94, сакратарыята 2-32-04.